Нашы землякі - удзельнікі грамадзянскай вайны

**У першай зале таксама размешчаны матэрыялы экспазіцыі № 3 "Нашы землякі - удзельнікі грамадзянскай вайны", якія прысвечаны жыццю і дзейнасці людзей у пачатку XX стагоддзя.**

## Першая руская рэвалюцыя

У перыяд першай рускай рэвалюцыі некаторыя сяляне нашай мясцовасці прымалі актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях. Праўда, удзельнікаў гэтых падзей ужо няма ў жывых, але памяць аб некаторых з іх захавалася. Так, жыхар в. Краснае Лежань Ігнат Мікалаевіч, прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях у г. Маскве. Быў судзімы царскім урадам і прыгавораны да 12 гадоў катаргі. Пасля адбыцця катаргі ён выехаў у ЗША.

Жыхары вескі Кайшоўка таксама прымалі актыўны ўдзел у рэвалюцыі 1905-1907г.г. Тут быў створаны забастовачны камітэт, які аказваў дапамогу рабочым фабрык Навагрудка і Баранавіч. Удзельнікамі гэтага камітэта былі Троско і Сыч, жыхары вёскі Кайшоўка.



# Кастрычніцкая рэвалюцыя, грамадзянская вайна

Нашыя землякі  ў 1917 годзе прымалі актыўны ўдзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі.









*Ураджэнцы раёна - ўдзельнікі ўзброенага паўстання ў Петраградзе*




*У 1918-1920 гады ішла грамадзянская вайна. Многія жыхары Цырына былі ўдзельнікамі гэтай вайны. На палях баёў загінулі і нашы землякі, ў асноўным жыхары вёскі Дорагава, Кайшоўка, Застадолле. Вы можаце бачыць іх на нашым стэндзе. Гэта Сыч Ю.С., Лежань П.А., Кадан І.А., Гладкі І. А., Сыч Р.С., Гладкі І.Ф., Будэйка М.І., Будэйка М. І., Зусько Я.Ю., Міхайлоўскі М.Я., Троска Я.Д.*